# БЕЛАРУСБАНК

**Адкрытае акцыянернае таварыства "Ашчадны банк "Беларусбанк"**

пр-т Дзяржынскага, 18, 220089, г. Мінск
Тэл.: (017) 218 84 31, факс: (017) 337 57 50
Тэлекс: 252408 PION BY
http://www.belarusbank.by
e-mail: info@belarusbank.by

**Открытое акционерное общество "Сберегательный банк "Беларусбанк"**

пр-т Дзержинского, 18, 220089, г. Минск,
Тел.: (017) 218 84 31, факс: (017) 337 57 50
Телекс: 252408 PION BY
http://www.belarusbank.by
e-mail: info@belarusbank.by

________ № ________

На № ________ ад ________

Аб разглядзе
электроннага паведамлення

Разгледзеўшы Ваша электроннае паведамленне, якое паступіла 17.06.2026 у ААТ «ААБ Беларусбанк» (далей — Банк) праз рубрыку адваротнай сувязі на карпаратыўным сайце Банка, паведамляем наступнае.

Банк заўсёды імкнецца ўзнімаць якасць аказання паслуг кліентам і сістэматычна ажыццяўляе мадэрнізацыю і ўдасканаленне сваіх каналаў дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання.

Што да пытання аб дабаўленні беларускамоўнай версіі інтэрфейсу ў мабільную праграму банка, інфармуем, што на дадзены момант Банк дае кліентам магчымасць выкарыстоўваць дзве мабільныя праграмы для фізічных асоб на выбар: мабільную праграму «M-Belarusbank» і новы канал дыстанцыйнага абслугоўвання — мабільную праграму «Belarusbank» у мабільным і PWA- фарматах.

Для мабільнай праграмы «M-Belarusbank» зараз працягваюцца неабходныя дапрацоўкі па ўкараненні магчымасці адлюстравання на беларускай мове асноўнай часткі інтэрфейсу, дзе мабільнай праграмай не выкарыстоўваецца кантэнт, атрыманы ад знешніх інфармацыйных сістэм. Завяршэнне тэхнічных работ і гатоўнасць абноўленага функцыяналу для кліентаў запланаваны на ліпень — жнівень 2026 года.

У новай мабільнай праграме «Belarusbank» лакалізацыя асноўнай часткі інтэрфейсу на беларускую мову ўжо рэалізавана і даступна кліентам для выкарыстання.

Дзякуем, што Вы з'яўляецеся кліентам нашага Банка, і спадзяемся на далейшае ўзаемадзеянне.

Дырэктар
разліковага цэнтра
плацежных картак А.У.Чыбрыкаў

795-19-008 Пракапчук 2152068
09.07.2026 Аб разглядзе электроннага паведамлення